Дзе, бывала, ні ступіш у Беларусі — *забалаці* ды *балаціны* спаткаеш. *Балотная* мы грамада, *дрыгвяная*. Бывае, закалыхаемся ў нейкім памкненьні... Ды зноў суцішымся, да супакою вернемся. Устойлівасьць надта любім. У стаячай вадзе лілеяў чакаем. А вакол — асака, твань ды застой.

Вось, вось — сёньняшнія „людзі на *балоце*" — зусім ня мележаўскія тыпажы. Наасушаліся, ды зноўку ў сваю *багну* пашыліся. Дзе пустэльні паўтваралі — там церпім рахмана. Дзе яшчэ купістая *багна* раскашуе — звыкла пабойваемся... Аднак, прымаем. Аго, як прымаем! Жытка нашая — суцэльнае *балота*. Ні жывога дзеяньня, ні зруху, ні павароткі... Зачараванае пагойдваньне *дрыгвы*... дзе які агеньчык міргане — і згасьне ў няволі.

Нам, добра застаялым, і выбірацца боязна.

*Балота* напрыканцы стагодзьдзя — гэта ўжо не *балотная* мэнтальнасьць палешука, што чэпка трымаецца свайго, жыве ў сваім адметным рытме. *Балота* цяпер — насамрэч гнілая *багна*. Усё перажылося й згінула. Адно бурбалкі йдуць. Яшчэ ж дыхае нашае *балота*.

# Басовішча

***Ян Максімюк***

Слова *Басовішча* зьявілася ці то пад канец 1989, ці то на пачатку 1990 году, калі беларускія студэнты высьпельвалі ідэю фэстывалю беларускай рок-музыкі ў Гарадку пад Беластокам. Гісторыя неяк не занатавала, хто першы прапанаваў такі назоў. Але, без сумневу, можна сьцьвярджаць, што слова прынялося на Беласточчыне адразу. Яно было растыражавана бадай ці не трыма тысячамі плякатаў з анонсам першага фэстывалю ў ліпені 1990-га. А пасьля гэтай імпрэзы стала вядомае і ў Беларусі.

Этымалёгія слова даволі простая — гэта абрэвіятура *БАС* (*Беларускае Аб'яднаньне Студэнтаў*, арганізатар фэстывалю) плюс салідны беларускі канчатак *-овішча*. Нехта потым спрабаваў зьвязаць паходжаньне слова з *бас-гітарай* — маўляў, на фэстывалі моцна *„басуюць"*, то бок граюць на *„басе"*, інакш, *бас-гітары* — але студэнцкі *БАС* адкінуў гэткую „народную этымалёгію" як прынцыпова няслушную. Затое студэнтам спадабаўся калямбур пісьменьніка Ўладзімера Арлова, які, пабачыўшы бурную рэакцыю гарадоцкай публікі на выступы беларускіх „цяжказбройных" гуртоў „Мроя" і „Ўліс", ахрысьціў фэстываль *Бясовішчам*.

*Басовішча* было словам зусім новым, бо прэзэнтавала зусім новую зьяву — беларускую рок-культуру, пазбаўленую савецкага штампу і расейскамоўнай афарбоўкі. Гэта была першая культурная зьява, у якой і дзякуючы якой беластоцкія маладыя беларусы знайшлі поўнае духоўнае паразуменьне з пад- і постсавецкімі суродзічамі. А таксама адчулі гонар за беларускую культуру перад маладымі палякамі, якія, пачынаючы зь першага фэстывалю, нязьменна складалі сама менш палову публікі ў гарадоцкім лесе, дзе йшлі канцэрты.

Бадай ці паўторыцца яшчэ дзе-небудзь такое, як у Гарадку, калі сотні маладых галасоў сьпявалі разам з Касяй Камоцкай, Сержуком Сокалавым-Воюшам, Віктарам Шалкевічам песьні пра Беларусь. А таксама пра „Радыё Свабода" з гуртам „Уліс"...